второе: В 55 т. - СПб.: Тип. II отд. Собств. Его Имп. Вел. Канцел., 1830—1884гг.

12. Сборник постановлений по Министерству народного просвещения: В 3 т. - СПб.: Тип. П.П. Сойкина, 1875—1876. - Т. 2. – С. 271-273.

13. Торжественное открытие Горы-Горецкой земледельческой школы 15 августа 1840 г. // Национальный исторический архив Беларуси. - Ф. 2259. Горецкий земледельческий институт. - Оп. 1. - Д. 24.

14. Шульгин, В.Я. Юго-западный край в последнее двадцатипятилетие (1838-1863) / В.Я Шульгин. - Киев, 1864. – С. 32.

## ВІЛЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ — КРЫНІЦА ДЭМАКРАТЫЧНЫХ ПЛЫНЯЎ НА БЕЛАРУСІ

Літвіноўская Ю. І г. Мінск, БДУІР

Першыя сімптомы націянальнага адраджэння на Беларусі паявіліся у 10-я – 20-я гг. XIX ст. Гэтыя сімптомы былі звязаны з дзейнасцю тайных таварыстваў, арганізаваных студэнтамі Віленскага універсітэта, таварыстваў філаматаў і філарэтаў, што было вельмі значнай з’явай у грамадскім жыцці Беларусі. Таварыствы ўзніклі сярод студэнтаў аднаго з лепшых вышэйшых навучальных установ Еўропы. Універсітэт узнік ў 1803 г. на базе існаваўшай з XVI ст. езуіцкай акадэміі, якая ў 1781 г. была пераўтворана ў Галоўную школу Вялікага княства Літоўскага.

Ініцыятарамі стварэння таварытсва былі два студэнты Тамаш Зан і Адам Міцкевіч. Усе яны былі з Беларусі. Зан нарадзіўся пад Маладзечна, Міцкевіч у Наваградку. Ідэя аб стварэнні згуртавання з’явілася ў верасні 1817 г., а 1 кастрычніка адбылося першая пасяджэнне групы. У ім узялі ўдзел шэсць студэнтау: Тамаш Зан, Адам Міцкевіч, Юзаф Яжоўскі, Эразм Палюшынскі, Ануфры Петрашкевіч і Бруна Сухецкі. Планавалася, што гэта будзе саюз аднадумцаў, надзейных і правераных сяброў, саюз, паводле выказвання Ю. Яжоўскага, “не на хвілю, не дзеля мімалётнай забавы, а на ўсе жыццё” [2, с. 8].

Заснавальнікі таварыства імкнуліся, каб новыя члены былі надзейнымі сябрамі, а таму прыём у яго меу шэраг абмежаванняў. У

выніку за гады дзейнасці таварыства яго колькасць не перавышала двух дзесяткаў сяброў. Акрамя шасці арганізатараў туды былі прыняты: Францішак Малеўскі, Зыгмунт Навіцкі, Юзаф Кавалеўскі, Ян Чачот, Тэадор Лазінскі, Дзіянісій Хлявінскі, Дамінік Ходзька, Казімір Пясецкі, Ігнат Данейка, Ян Сабалеўскі, Міхал Руневіч, Вінценты Будрэвіч, Станіслаў Казакевіч. Таварыства філаматаў састаяла амаль поўнасцю з беларускай моладзі. Адзіным не беларусам тут быў украінец Юзаф Яжоўскі [2, с. 9, 16].

Мэтай згуртавання, як значылась у статуце, прянятым 1 кастрычніка 1817 г., на першым пасяджэнні таварыства, была "узаемадапамога ў паглыбленні адукацыі, у творчым удасканальванні, грамацкая праца для дабра зняволенай Айчыны". У новым жа статуце, прынятым у 1818 г., гэтая задача некалькі ускладняецца. Цяпер таварыства павінна было садзейнічаць "па меры магчымасці ўсеагульнай асвеце" [2, с. 9].

Асвета для філаматаў была аднім з інструментаў барацьбы за вызваленне Айчыны. Пад Айчынай студэнцкая моладзь Віленскага універсітэта разумела Рэч Паспалітую. Такім чынам, беларускія хлопцы, члены таварыства філаматаў былі перш за ўсе польскімі патрыётамі. Але як пісаў вядомы беларускі даследчык У.М. Ігнатоўскі: "…трэба ўсе ж такі адзначыць, што сярод апалячынай беларускай шляхты ў універсітэце адчуваюцца мясцовыя сымпатыі. Устанаўляецца погляд на Белаусь, як на зусім асобную правінцыю Польшчы, што не подабаецца польскім патрыётам з Варшавы, якія з'яўляюцца абаронцамі адзінай непадзельнай Польшчы. Шырока развіваюцца патайныя праціўрадавыя гурткі моладзі, на чале якіх становяцца Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Тамаш Зан і інш." [5, с. 168].

На сваіх пасяджэннях яны абмяркоўвалі як навуковыя даклады, так і сваі літаратурныя творы. Навуковыя даследаванні філаматаў былі вельмі разнабаковымі: літаратура, філасофія, гісторыя, геаграфія, прыродазнаўчыя навукі. Для прыклада можна назваць: "Праванская паэзія", "Пра класіцызм", "Пра Сафокла", "Пра характары", "Гісторыя вышэйшай улады ў Літве", "Пра становішча сялян"; "Апісанне падарожжа на Валынь і Украіну", "Пра электрычнасць", "Вылічэнне некаторых мінералагічных сістэм" і г.д. [2, с. 10]. Таварыства філаматаў было канспіратыўным згуртаваннем. Але паставіўшы перад сабой вялікія задачы асветы

народа яны імкнуцца ўстанавіць сувязі і з іншымі апазіційнымі ўладам арганізацыямі як то, віленскае згуртаванне Польскага Патрыятычнага таварыства, дзекабрыстамі (праз Аляксандра Бястужава), масонамі, шубраўцамі.

Яшчэ аднім напрамкам дзейнасці філаматаў было намаганне стварыць больш прадстаўнічых, больш масавых арганізацый. У выніку, па ініцыятыве і пры актыўным удзеле Тамаша Зана была створана Таварыства прамяністых – згуртаванне тых, хто імкнецца быць высокамаральнымі, духоўна багатымі людзьмі, інакш кажучы людзьмі, якія выпраменьваюць святло і тым самым дабратворна ўдзейнічаюць на іншых. Члены таварыства не былі абцяжараныя навуковымі пошукамі. Форма дзейнасці прамяністых – маёўкі, агульныя пагулянкі, розныя рытуалы. Усе гэта прыцягвала віленскую моладзь і таварытства вельмі хутка расло. Але масавасць арганізацыі напалохала універсітэцкія ўлады і рэктар Сымон Малеўскі загадаў распусціць таварыства.

Філаматы распускаюць адкрытае таварыства прамяністых, але тут жа на яго аснове ствараюць новае тайнае таварыства прыхільнікаў маральнай чысціні, куды залічылі толькі найбольш надзейных юнакоў. У рэзультаце ля тайнага таварыства філаматаў паявіўся яго малодшы сабрат тайнае таварыства філарэтаў. Некалькі змяніліся і задачы новай тайнай арганізацый. Фіалрэты павінны былі займацца не толькі маральным удасканальваннем, але і самаадукацыяй, удасканальваць сваю асвету. Філаматы імкнуліся пашырыць дзейнасць новай арганізацыі і адкрыць філарэцкія філіі ў іншых гарадах былога Вялікага княства Літоўскага – Навагародке, Коўне, Шчучыне, Беластоку, Свіслачы.

Асаблівае значэнне ў дзейнасці філаматаў і філарэтаў мелі іх імкненні па вывучэнню роднага краю, сістэмнаму і шырокаму збору розных звестак пра родны край. Пры гэтым на першым месцы стаяла вывучэнне стану асветы, школ. Маладыя людзі абмяркоўваюць магчымасць стварэння падручнікаў для школ, адкрыцця ўласнага перыядычнага выдання. Філаматы і філарэты былі першымі хто звярнуў увагу на традыцыйную культуру беларусаў, абрады і звычаі, вусную творчасць, самабытнасць мовы. Даследчыкі адзначаюць, што яшчэ ніколі да гэтуль не назіралася такого шырокага і плённага “наплыву ў літаратуру беларускага фальклору, як гэта бачым у творах філаматаў і філарэтаў”.

Узводзячы на высокі алтар літаратуры фальклор беларуса, усю яго традыцыйную культуру, філаматы і філарэты не маглі абыйсці тут увагаю і мову свайго беларускага народу.

У сваіх выказваннях яны адзначалі самабытнасць яе, мілагучнасць, паказвалі, што яна нічым не саступае любой іншай еўрапейскай мове, а ў нечым нават і пераўзыходзіць па прыгажосці асобныя з іх, што адзначалі асабліва Адам Міцкевіч і Ян Чачот [2, с. 21]. Амаль усе філаматы паходзілі з апалячанай беларускай шляхты. Будучыню Беларусі, а ў іх разуменні гэта было Вялікае княства Літоўскае, яны бачылі ў аднаўленні былой Рэчы Паспалітай. Пры гэтым філаматы і філарэты заўседы памяталі, што іх радзіма Беларусь, у іх разуменні "Літва". На гэтую абставіну ўказвалі і царскія следчыя, якія вялі разбіральніцтва па справе таварыства філарэтаў. Яны "ясно обнаруживали, что под словом приверженности к своему краю разумелось не приверженность к Российской империи вообще, но только к губерниям, составляющим виленский университетский округ…" [2, с. 20].

Гэтая акалічнасць, а фактычна беларускі патрыятызм філаматаў і філарэтаў дазваляе гаварыць аб іх як пра пачынальнікаў беларускага нацыянальнага адраджэння. Віленскія згуртавання моладзі звярнулі на сябе ўвагу царскіх улад пасля выпадку, які меў месца ў Віленскай гімназіі. 3 мая 1823 г. у гадавіну польскай Канстытуцыі 1791 г. вучань пятага класа Міхал Плятэр напісаў крэйдай на класнай дошцы "Няхай жыве канстытуцыя 3 мая!" Пра гэта стала вядома вялікаму князю Канстанціну. Пачалося следства. Пад час следства быў арыштаваны філарэт Ян Янкоўскі. Ён і выдаў усіх членаў Таварыства.

Адносна колькаснага склада таварыства філарэтаў сведчаць такія лічбы. На 24 жніўня 1822 г. яна складала 215 чалавек, 16 мая 1824 г. следчая камісія, якою кіраваў сенатар М. Навасільцаў, мела спіс са 166 філарэтаў, дапытана камісіяй было 135 [1, с. 30; 2, с. 16]. Адносна таварыства філаматаў камісія Навасільцава нічога не ведала. На яго след удалось выйсці выпадкова. На пачатку 1824 г. у Берліне арыштавалі Ф. Малеўскага. Не маючы звестак з Вільні ен падумаў, што паліцыя выкрыла абодва таварыства і на допыце прагаварыўся пра іспаванне філамацкага згуртавання. Пачаўся новы віток следства які закончыўся толькі ў красавіку 1824 г. Рашэнне аб тым як паступіць з бунтаўшчыкамі павінна была прыняць

спецыяльная камісія ў складзе міністра асветы Шышкова, генерала Аракчэева і сенатара Навасільцава. 14 жніўня 1824 г. Аляксандр I гэтае рашэнне зацвердзіў. Згодна с ім 20 філаматаў і філарэтаў, у т. л. Адам Міцкевіч, Тамаш Зан, Ян Чачот, Адам Петрашкевіч, Адам Сузін былі высланы ў розныя губерніі Расіі, а некаторыя нават на Урал. 80 "бунтаўшчыкоў" былі адпушчаны пад нагляд паліцыі [2, с. 18].

Увасобліваючы першую хвалю беларускага нацыянальнага адраджэння ўдзельнікі віленскіх тайных арганізацый адчувалі сябе часткай вызваленчай барацьбы народаў Еўропы, барацьбы якая на пачатку XIX ст. уздымалася у Гішпаніі, Італіі, Грэцыі, Валахіі і іншых краіна. У гэтай сувязі філамат Т.Зан пісаў: "Дух счастливых перемен быстро распространяется и в скором времени охватит все европейские народы. Содрогнется земля и начнутся неожиданные извержения вулканов, настало время, когда над тьмой предрассудков восходит заря счастливых предзнаменований, Европа стала ныне свидетельницей "практических лекций публичного права, когда и огнём и мечом истребляются троны" [1, с. 15].

Тут неабходна дадаць, што ў канцы XVIII – напачатку XIX стст. узмацняюцца агульнадэмакратычныя рухі, імкненне народаў за свабоды. Ідэі незалежнасці сталі дамінуючымі ў палітычным жыцці. У выніку характар ідэалогіі віленскіх таварыстваў выспяваў ва ўмовах грамадскага абуджэння, якое нарастала пасля напалеонаўскіх войнаў як у Заходняй Еўропе, так і ў Расіі. А гэта значыць, што з'яўленне ў Беларусі тайных таварыстваў у гэты момант было падзеяй цалкам натуральнай, адпавядала духу часу.

Філаматы былі людзі вельмі адукаваныя, выхаваныя на традыцыях Асветніцтва. Яны былі прасякнуты ўсведамленнем важнасці і неабходнасці вывучэння беларускага фальклора з тым каб праз польскую літаратуру зрабіць яго здабыткам усёй сусветнай культуры. Збіраючы легенды, паданні, казкі, прыказкі, песні простага народа, вывучаючы яго норавы і звычаі яны не толькі спрабавалі спасцігнуць сутнасць народнага светаўспрымання, але і перадаць свой пункт гледжання на асобыя жыццёвыя акалічнасці праз народную мову.

Пры разгледжанні дзейнасці таварыства філаматаў нельга не звярнуць увагу на ўласцівыя ім два накірункі прыкладання сіл. Першы, гэта шлях самаўдасканалення, праз вывучэнне мноства

розных навук, замежных моў, напісанне ўласных навуковых прац, школьных падручнікаў і г.д. Другі накірунак, гэта папулярызацыя сваіх ідэй сярод моладзі. Калі пытанні самаўдасканалення варашаліcь сярод 19 членаў тайнага таварыства, то дзеля распаўсюджвання сваіх поглядаў філаматы ствараюць падкантрольныя ім арганізацыі, якія аб'ядноўвалі шырокія кругі перш за ўсе студэнцкай моладзі. Найбольш значнай сярод гэтых арганізацый быў "Саюз сяброў". Ён быў створаны ў красавіку 1819 г. і аб'ядноўваў ад двухсот да трохсот чалавек, уключаючы і ўсіх філаматаў [1, с. 23, 25]. Гэта значыць трэцью частку ўсяго вілейнскага студэнцтва [3, с. 52]. На "Саюз сяброў" ускладаліся задачы звязаныя з асветай народа, ён павінен быў стаць сваеасаблівай лабараторыяй па практычнаму засваенню і выкарыстанню тэарэтычных ведаў.

Вельмі шырокай папулярнасцю сярод студэнцкай моладзі карыставаўся Саюз прамяністых. Па задумцы філаматаў гэта павінна было быць згуртаванне не абцяжаранае навуковымі задачамі, а галоўнай мэтай яго удзельнікаў павінна было стаць толькі маральнае удасканаленне. Кожны дабразычлівы, высокамаральны чалавек випраменьвае святло і тым самым дабратворна ўдзейнічае на іншых. Так тлумачылі сэнс «прамяністасці» філаматы. Гэта была легальная арганізацыя. Яе устаў які складаўся з 15 правіл схваліў і зацвердзіў рэктар універсітэта Сымон Малеўскі. У адным з іх сцвярджалася, што найбольш важным на шляху да маральнага ўдасканалення з'яўляецца "прыхільнасць да айчыннай зямлі".

"Прыхільнасць да айчыннай зямлі ў тым, каб жадаць дабра суайчыннікам кожнага стану і ўсяму народу наогул, захоўваць карэнныя звычаі сваіх бацькоў і любіць прыродную мову і вывучаць яе, помніць славу і подзвігі продкаў і ў меру сілы сваёй і стану памнажаць іх" [2, с. 13]. Рух "прамяністых" выклікаў жывы водгук сярод студэнцкай моладзі Вільні. Такія маральныя якасці як сціпласць, датрыманне дабрачыннасці, любоў да блізкага і бацькаўшчыны набылі шырокае распаўсюджванне. Натхнёныя грамадска значнай мэтай студэнты сталі лепш вучыцца, наведваць лекцыі, сціпла весці сябе ў касцёле.

Адзначаючы дабратворны ўплыў прамяністых на моладзь Ян Чачот гаварыў: "…цяпер на лекцыі фізікі, ціха як у вуху!

Найгоршыя свавольнікі … нават на лекцыях прафесара, з якога можна пасмяяцца, сядзяць як, быццам іх і няма! У касцёле ўсе паводзяць сябе сціпла Такі вось вескі ўплыў некалькіх на непараўняльна большую масу людзей, так бярэцца ўсімі добры прыклад” [2, с. 14]. Але змена студэнцкіх паводзін напалохала адміністрацыю універсітэта і некаторых прафесараў. Рэктар С. Малеўскі спалохаўся, што гэтай акалічнасцю зацікавіцца паліцыя і загадаў распусціць таварыства.

Філаматы выканалі загад рэктара, але на месцы былога легальнага згуртавання арганізавалі тайнае з новай назвай. У выніку восенню 1820 г. узнікла таварытсва прыхільнікаў маральнай чысціні – таварыства філарэтаў [1, с. 29]. Толькі найбольш надзейныя “прамяністыя” сталі членамі новай арганізацыі. Больш шырокімі сталі задачы таварыства. Яго члены павінны былі займацца не толькі маральным удасканаленнем, але і асветай, самаадукацыяй, навуковай працай. Філарэты імкнуліся да плённага выкарыстання атрыманных ведаў, але яны рашуча бароліся з застарэлымі забабонамі згодна з каторымі навука, якая не дае непасрэдных практычных вынікаў аб’яўлялася залішняй. Фактычна гэта была школа пасляўніверсітэцкай адукацыі. Арганізацыя філарэтаў стала найбольш шматлікім згуртаваннем віленскай моладзі, сярод тых якія былі створаны філаматамі.

Філарэты рыхтаваліся да рэальнай работы. Яны павінны былі стаць праваднікамі сярод насельніцтва асветніцкіх ідэй філаматаў. Але пры гэтым неабходна адзначыць, што па меры пашырэння таварыства ўзнікаюць і новыя мэты. Моладзь не хацела абмяжоўвацца толькі навукай і дабрачыннасцю. Узмацнялася імкненне да палітыкі. Не выпадкова Ян Чачот пісаў: “Нужно действовать так, чтобы каждый учился мыслить как законодатель и правитель, а также знал, что следует делать в собственном доме и как поступать вне его” [1, с. 33]. Такім чынам, філаматы і члены створанных імі таварystваў паступова падыходзяць да вывучэння сацыяльна-палітычных і эканамічных праблем свайго часу.

Пры гэтым неабходна адзначыць, што ў цэнтры іх увагі быў просты люд, селянін-беларус, яго дабрабыт, яго будучыня. Несці асветніцкія ідэі ў масы вясковага насельніцтва яны лічылі магчымым толькі праз культуру і мову беларусаў. Толькі пры дапамозе мовы філаматы збіраліся несці святло асветы ў самыя

“нізы”. У гэтай справе найбольшых поспехаў дасягнуў Ян Чачот, шэраг твораў якога былі напісаны па-беларуску, як таго і патрабавала таварыства. Элементы беларускай мовы прысутнічалі і ў творчасці іншых філаматаў і філарэтаў Адама Міцкевіча, Томаша Зана, Ануфрыя Петрашкевіча, Аляксандра Ходзькі. Тым не меньш таварыствы віленскай моладзі не змаглі па-сапраўднаму разгарнуць сваю дзейнасць у гэтым напрамку. У выніку рэпрэсій царскіх уладаў яны вымушаны былі прыпыніць сваю работу. Але іх вольналюбівыя ідэі, погляды і ўчынкі, паслужылі прыкладам для будучых пакаленняў змагароў за нацыянальнае адраджэнне беларусаў.

Гурткі віленскай моладзі былі толькі першым крокам на шляху культурна-нацыянальнага адраджэння беларусаў, у справе станаўлення беларускай культурнай традыцыі. Падобныя працэсы, з большай, ці меньшай адметнасцю мелі месца ў гісторыі многіх славянскіх народаў, якія не мелі своёй дзржаўнасці. На Беларусі яны адбываліся ў вельмі складаных умовах. Землі на якіх жыло беларускае насельніцтва на пачатку XIX ст. не мелі адзінай назвы. Менская, Гарадзенская і Віленская губерні называліся “Літвою”, а Віцебская і Магілеўская губені былі “Беларускімі”. Польскі культурны ўплыў на ўсе пяць губерняў, асабліва ў першай чвэрці XIX ст. быў абсалютны. Галоўную ролю ў гэтай справе адыгрываў заснаваны 24 студзеня 1803 г. Віленскі універсітэт на чале з куратарам навучальнай акругі кн. Ад. Чартарыйскім. У выніку ў першай палове XIX ст. уласна беларускай культурнай традыцыі яшчэ не існавала. Працэсы аб якіх мова ішла вышэй сведчаць аб тым, што рабілісь толькі першыя крокі на шляху яе станаўлення.

Працэсы культурна-нацыянальнага адраджэння, якія пачалі развівацца на Беларусі з пачатку XIX ст. гэта былі першыя зярняты кінутыя ў глебу на ніве фарміравання нацыянальнай свядомасці беларусаў. Разам з тым неабходна адзначыць, што яны не ўзніклі на пустым месцы. Гэтыя працэсы былі выкліканы да жыцця агульным станам тагачаснага грамадства, тымі тындэнцыямі якія былі яму ўласцівы, характарам палітычнай ідэалогіі. Канец XVIII – пачатак XIX ст. час, калі на Беларусі, пад уздзеяннем еўрапейскіх падзей актывізуецца унутрыпалітычнае жыццё, пачынаюць стварацца грамадска-палітычныя аб’яднанні, у сацыяльна-палітычнай думцы паступова афармляюцца два супрацьлеглыя адзін другому

ідэалагічныя напрамкі – лібералізм і кансерватызм [4, с. 48; 6, с. 6-7].

Характэрызуючы ўнутранную сітуацію на Беларусі на пачатку XIX ст. неабходна адзначыць, што ўз’яднанне беларускіх зямель у межах адзінай дзяржавы, у дадзеным выпадку Расійскай імперыі, спрыяла кансалідацыі насельніцтва, абуджэнню ідэі адзінства беларускага народа, і ў канчатковым выніку росту сацыяльна-палітычнай свядомасці ў народзе.

**Выкарыстаная літаратура**


1. Мохнач, Н.Н. Общественно-политическая и этическая мысль Белоруссии начала XIX в. / Н.Н. Мохнач. – Минск, Наука и техника, 1985. – 94 с.
2. Філаматы і філарэты. Зборнік. – Мінск, Беларускі кнігазбор. – 1998. – 400 с.
3. Сувалова, Е.Н. История общественных движений и политических партий / Е.Н. Сувалова. – Минск, 2005. – 216 с.
4. Сакалова, Мар’яна. Пачатак ліберальнага руху ў Беларусі / Мар’яна Сакалова // Штогоднік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, 1999. – Мінск, 1999. – с.48-56.
5. Ігнатоўскі, У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / І.М. Ігнатоўскі. – Мінск, Беларусь, 1991. – 192 с.
6. Соколова, М.А. Общественные объединения и движения как факторы формирования гражданского общества в Беларуси (конец XVIII – начало XX в.) / М.А. Соколова. – Автореферат дис. на соиск. уч. ст. канд. ист. наук. – Минск, 2000. – 20 с.


## К ВОПРОСУ ГУМАНИТАРИЗАЦИИ ИНЖЕНЕРНОГО ОБРАЗОВАНИЯ


Лойко Т. В., Шибалко В. В. г. Мінск, БНТУ


Высшая школа готовит высокообразованных специалистов. Каждая специальность имеет свою специфику и определенные конкретные требования. Особые требования предъявляются сегодня к специалистам техносферы – инженерам, конструкторам, проектировщикам, как к основным фигурантам научно-технического прогресса. В докладе раскрывается роль инженерно-технических ра-